# МІРНА ЖЫЦЬ — ШЧАСЛІВЫМ БЫЦЬ



**Мы пазнаёмімся** з вершамі і апавяданнямі пра мужнасць і гераізм людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны, пра жыццё дзяцей у пасляваенны час і ўшанаванне герояў.

**Мы будзем вучыцца:**

- ✓ вызначаць час і месца падзей, што паказаны ў мастацкіх творах;
- ✓ назіраць, хто распавядае ў творы — аўтар ці яго герой;
- ✓ тлумачыць учынкі дзейных асоб, выказваць свае адносіны да іх;
- ✓ выразна чытаць верш з гэтага раздзела і перадаваць яго настрой;
- ✓ падрабязна пераказваць частку апавядальнага твора па складзеным плане.

**Варта задумацца.** Чаму людзі і ў нашы дні даглядаюць помнікі героям і ахвярам Вялікай Айчыннай вайны?



Правообладатель Национальный институт образования

## Творчае заданне

1. Разгледзьце малюнак на с. 77.

2. Адкажыце на пытанні.

1) Якая пара года адлюстравана на малюнку?

2) Дзе знаходзяцца хлопчык і дзяўчынка?

3) Чым яны заняты? Раскажыце.

4) Ці падыходзіць малюнак да назвы раздзела «Мірна жыць — шчаслівым быць»? Дакажыце.

5) Каму мы павінны быць удзячнымі за мірнае неба над галавой? Знайдзіце падказку на малюнку.

---

**Маўленчая размінка.** Прачытайце верш. Правільна вымаўляйце гукі [ч], [р], [ц’], [дз’].

### Тры чарадзеі

Тры **ча**ра**дзе**і
На све**це** **жы**ву**ць**.
Ут**р**ох яны сею**ць**,
Ут**р**ох яны жну**ць**…
Т**р**ы **ча**ра**дзе**і
На све**це** **жы**ву**ць**.
Іх П**р**ацаю,
Д**р**ужбаю,
Мі**р**ам
Заву**ць**.

*Міхась Пазнякоў.*



Правообладатель Национальный институт образования

***Зажу́раны*** — сумны, маркотны.
***Ку́ля*** — невялікі свінцовы прадаўгаваты снарад для стральбы з ручной агнястрэльнай зброі і кулямёта.
***Грудо́к*** — невялікая горка, узгорак.
***Паго́жы*** — ясны, цёплы.
***Удава́*** — жанчына, у якой загінуў або памёр муж.

**МІХАСЬ ПАЗНЯКОЎ**



## Помнік герою

Герою з Масквы ці з-за Дона,
Майму земляку ці з-за Волгі
Пад юным зажураным клёнам
Стаіць абеліск ля дарогі.
Далёка ад роднага краю
Сцяжыну яго абарвала
Тупая варожая куля.
Хавала яго не матуля.
Салют не грымеў над грудком —
Хавалі салдата цішком
Уночы жанчыны-сялянкі
На мужнай зямлі партызанскай.

Не быў ён знаёмы нікому,
Застаўся таму невядомы.



Правообладатель Национальный институт образования



У Дзень Перамогі пагожы
Абнеслі грудок агароджай.
Чырвоная гордая зорка
Заззяла над сумным пагоркам.
Удовы з адноўленай вёскі
Пасеялі побач валошкі,
Маленькую лаўку зрабілі
І клён малады пасадзілі.

Расце ён, салдату спявае
Пра маці, што дома чакае.

1. Які настрой выклікаў у вас верш Міхася Пазнякова?
2. У памяць аб кім стаіць каля дарогі абеліск? Чаму на ім не напісана імя пахаванага салдата?



Правообладатель Национальный институт образования

3. Якую гісторыю з жыцця героя расказвае паэт? Прачытайце адпаведны ўрывак з твора.
4. Па чым можна здагадацца, што салдата пахавалі беларускія жанчыны? Адказ падмацуйце радкамі з верша.
5. Як ушаноўваюць памяць аб загінуўшым? Прачытайце.
6. Разгледзьце ілюстрацыю да верша (с. 80). Якімі радкамі з твора яе можна падпісаць? Прачытайце.
7. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша з адпаведнымі настроем і інтанацыяй.

**Давайце абмяркуем.** Чаму людзі павінны помніць пра герояў Вялікай Айчыннай вайны?

***Лютава́ць*** — праяўляць жорсткасць.
***Во́бмацкам*** — пры дапамозе дотыку, абмацваючы.
***Не мог даўме́цца*** — не мог здагада́цца.
***Канту́зіць*** — нанесці ўдар або траўму арганізму (пры выбухах, разрывах снарадаў) без пашкоджання покрыва цела.
***Лазарэ́т*** — невялікая бальніца пры вайсковай часці.
***Байні́ца*** — адтуліна ў сцяне абарончых збудаванняў для стральбы.



Правообладатель Национальный институт образования